

КЛІМАВІЦКАЯ ІНФА-ПАНАРАМА

№5(103)

10 чэрвеня 2013 Клімавіцкі грамадска-палітычны бюлетэнь

НАСТАЎНІК? А КОЛЬКІ ТЫ НАРЫХТАВАЎ МАКУЛАТУРЫ?

У Клімавіцкім раёне, што на Магілёўшчыне, настаўнікі вымушаны збіраць макулатуру, металалом, пластыкавыя бутэлькі, каб выканаць даведзены школам план здачы другаснай сыравіны. Якім чынам гэта адбываецца, нашы чытачы могуць даведацца з матэрыяла, падрыхтаванага інфармацыйнай кампаніяй БелаПАН.

Знайсці другасную сыравіну ў раёне цяжка: металалом вывозяць у суседнюю Расію, а выканаць патрабаванне наконт макулатуры перашкаджае тое, што людзі не выпісваюць, як раней, газет і не купляюць кніг. Вучні не маюць ахвоты дапамагаць настаўнікам.

Пра тое, што клімавіцкія педагогі вымушаныя самі збіраць другасную сыравіну, паведаміў адзін з іх. Сваё імя ён папрасіў не называць. Паводле настаўніка, вучні яе збіраюць, але іхні ўнёсак у выканне плану нязначны. Педагогі самі ходзяць шукаць макулатуру, металалом, пластыкавыя бутэлькі.

Настаўнік кажа: «Металалом у Расіі даражэйшы, усё вывозіцца туды, і тут знайсці што-небудзь складана. Вышукваюцца месцы, дзе нікога не было, і выцягваецца адтуль усё, што змагло даляжаць да нашага з'яўлення. Гэта ўсё адмоўна адбіваецца і на іміджы настаўніка. У нас дзеці могуць пагрэбаваць цягнуць у школу тое, што вымушаны здабываць настаўнік».

Суразмоўца зазначае: настаўнікі незадаволеныя, што мусяць займацца абы-чым. Незадаволенасць, аднак, не выходзіць за межы педагагічнага калектыву, бо адкрыта выказвацца настаўнікі баяцца: «Знайсці працу ў раёне пасля такіх выказванняў будзе нерэальна. У нас жа рэпрэсія адна — кантракт не працягнулі. Зразумела, гэта ненармальная сітуацыя, калі людзей літаральна тэрарызуюць у адкрытую вось гэтай непрафесійнай дзейнасцю. Дзяржаве мо й выгадна, што ёй дастаецца сыравіна за бесцань, але ж у пройгрышы застаецца прафесійная дзейнасць».

У Клімавіцкім райвыканкаме пацвердзілі, што настаўнікі збіраюць другасную сыравіну. Паводле чыноўнікаў, яны выконваюць загад вышэйстаячых арганізацыяў: «Летась быў план здачы металалому — 70 тон на аддзел адукацыі, сёлета — 66 тон. Гэта ж па ўсёй вобласці, не толькі ў нашым раёне. Аддзелам адукацыі даведзены план. Вось макулатуры трэба сабраць за 200 тон на аддзел адукацыі. Палімеры, тэкстыль — таксама. Гэта ж другасная сыравіна — ад гэтага ж залежыць магутнасць нашай краіны. Усё ідзе на перапрацоўку».


Клімавіцкі журналіст Сяргей Аржанцаў, які адпрацаваў у адукацыі 18 гадоў, паведаміў, што паводле справаздачы райвыканкаму, у раёне летась было нарыхтавана амаль 350 тон макулатуры, 42 тоны палімерных і 300 тон шкляных адкідаў. Але трэба ўлічваць, што закупныя цэны на другасную сыравіну невысокія:

«Такая колькасць збіраецца з дапамогай прымусовых мер. Мой знаёмец, настаўнік з вясковай школы, кажа, што ў іх педагогам даведзены план — кожнаму па 180 кілаграмаў прынесці макулатуры. То адчуваеш, у якім становішчы яны апынуліся. Сітуацыя, я вам скажу, абуральная».

Збіраць другасную сыравіну ў школах бяруцца больш пад канец навучальнага году. Калі ў вялікіх гарадах макулатуру знайсці няцяжка, то ў невялікіх райцэнтрах і вёсках з гэтым праблема, бо людзі ўжо не выпісваюць столькі газет і не купляюць столькі кніг, як раней. Што да палімерных адкідаў — пластыкавых бутэлек, то іх звычайна ў вялікіх гарадах збіраюць бадзягі.

Эканаміст Андрэй Юркоў лічыць, што чакаць вялікага эканамічнага эфекту ад удзелу ў зборы другаснай сыравіны настаўнікамі і школьнікамі не выпадае. Калі школы і ўцягваць у нарыхтоўку другаснай сыравіны, дык толькі дзеля адукацыйна-асветніцкіх мэтаў: «Каб дзеці з дзяцінства прывыкалі, што другасную сыравіну трэба збіраць. Што трэба аб нашым навакольным асяроддзі турбавацца. А ў нас жа настаўнікі — абсалютна залежныя людзі ад гэтай сістэмы. Ім трэба выконваць планы, куды ім падзецца. Тут эканомікай і не пахне».





ЗАРАНЕЕ УБЫТОЧНЫЙ ФОК

Александр ВЛАД

Однажды император Александр I спросил у знаменитого историка Карамзина, как, по его мнению, можно охарактеризовать ситуацию в Российской империи. Тот лаконично констатировал: «Воруют, государь». Если бы другой Александр, а именно президент Лукашенко, задал мне тот же вопрос о Беларуси, то я бы ответил: «Дорого». Смысл сказанного в том, что это слово стало уже непременным сопровождающим эпитетом для многих других слов. Согласитесь, что у нас — дорогое сельское хозяйство и дорогие коммунальные расходы, дорогой бензин для автомобилистов и дорогая нефть для экономики, дорогое лечение и дорогое образование для простых граждан. Продолжать можно бесконечно, естественно, не забывая при этом, что говорить свободно в нашей стране тоже дорогое удовольствие. Поэтому давайте поговорим не обо всё сразу, а о чём-нибудь конкретно.



Задумывался ли кто-нибудь из вас, во что обходится стране содержание спорта? Как правило, всё ограничивается банальными рассуждениями на тему «Беларусь — спортивная страна». Это, мол, важно для здоровья нации, поэтому на этом не экономят. Не оспаривая общепринятых взглядов, всё же отмечу, что стадионы, бассейны, тренировочные залы и корты не возникли из воздуха. А многочисленные клубы, команды и федерации питаются не манной небесной, а чем-то более существенным. Если точнее, то доходы в несколько тысяч долларов в месяц никогда не считались запредельными среди профессиональных спортсменов.

Разумеется, совать нос в чужой карман не вполне этично. Хотя какая там к чёрту этика, когда минимум треть страны выживает от зарплаты до зарплаты. Согласно опросам Института социологии РБ порядка 35% жителей Беларуси считают себя бедными или даже нищими. И только 0,1% белорусов посчитали себя богатыми. Так что задавать вопросы о цене вложений в спорт и полученной отдаче более чем уместно. Характерно, что обратило своё высочайшее внимание на эту тему и руководство страны. Раньше Александр Лукашенко не отличался подобной меркантильностью, но череда обвальных девальваций, в конце концов, вынудила и его признать, что спорт чересчур дорог для государственного бюджета. Ничего удивительного — белорусский спорт также стал дорогим, как и всё остальное за последнее время.

Как закономерный итог, последовало указание стремиться к экономии и переходить на самофинансирование. В частности, непосредственным следствием этого стала проводимая сейчас реорганизация отделов физической культуры, спорта и туризма в райисполкомах. Ну и, разумеется, спорторганизации любого уровня и подчинения теперь обязали использовать всякую возможность для заработка на своё содержание. Только вот как осуществить эти благие пожелания? К примеру, у нас в районе Климовичская детско-юношеская спортивная школа давно пытается внедрить коммерческий подход в свою деятельность. Всем желающим предлагаются услуги по прокату спортивного инвентаря. Прокат велосипедов, теннисных столов и т. д. Но очевидно, что выжить и, тем более, развиваться на собранные крохи невозможно.

Населённый пункт	Количество жителей на 1.01.2013
Кобрин	52.001 чел.
Берёза	29.328 чел.
Пружаны	18.884 чел.
Любань	11.186 чел.
Белыничи	10.598 чел.
Климовичи	16.383 чел.

В конце весны в Климовичи приезжал журналист из республиканской газеты «Спортивная панорама». Из опубликованного материала можно узнать о насущных проблемах местного спортивного сообщества. Это непригодность футбольного поля на городском стадионе, недостаточное финансирование, никудышная ситуация с зарплатами тренеров и инструкторов. Начальник отдела райисполкома Владимир Щербин сообщил газете, что «полтора миллиона рублей — не та зарплата, которая может привлечь грамотного и квалифицированного специалиста». Так что ни настоящее положение, ни ближайшее будущее оптимизма не вызывают.

Кстати, вот ещё один дополнительный штрих к безрадостным спортивным перспективам Климовичского района. В апреле состоялось заседание Республиканской комиссии по повышению эффективности работы спортивных сооружений. Рассматривался вопрос, как сделать физкультурные комплексы окупаемыми. Оценив загрузку действующих ФОКов в Кобрине, Березе, Пружанах, Любани, Белыничах, специалисты пришли к выводу, что с учётом соотношения плотности населения и пропускной способности этих сооружений их сложно окупить даже на 30 процентов. В связи с этим было рекомендовано обязательно учитывать при строительстве новых ФОКов демографическую ситуацию в населённом пункте, так как от этого напрямую зависит окупаемость объекта. Как известно, в Климовичах ФОК начали строить ещё несколько лет назад, но после президентских выборов 2010 года все работы были прекращены. Если исходить из рекомендаций Республиканской комиссии, продолжать строительство просто нецелесообразно. Всё равно потом не окупится. Потому что — дорого.



ЦІ БУДЗЕ Ў ПАЎЛАВІЧАХ ЧЫСТАЯ ВАДА?

Алёна ПАЛЯКОВА

Прэсавая служба БХД (Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя) паведаміла аб звароце жыхароў вёскі Паўлавічы Клімавіцкага раёну. У сярэдзіне траўня грамадскі актывіст, жыхар вёскі Аляксандр Балобін звярнуўся ў сельсавет з просьбай. Мэтай звароту стаў калодзеж, занядбанае становішча якога ўжо даўно патрабавала рамонту.

13 траўня Аляксандр Балобін звярнуўся да старшыні Гусаркоўскага сельскага савета Анатоля Васільева з просьбай адрамантаваць калодзеж у вёсцы Паўлавічы. У адказ старшыня сельсавета паабяцаў падаць заяўку, каб зрабіць рамонт і чыстку студні. Праз некалькі дзён, падчас наведвання вёскі пажарным інспектарам і Анатолем Васільевым, сяляне зноў ўзнялі перад афіцыйнымі асобамі гэтае пытанне.

Урэшце рэшт, рамонт быў зроблены, але толькі часткова. А галоўнае — ніхто не чысціў калодзеж. Аляксандр Балобін праінфармаваў Прэсавую службу БХД, што ў калодзежы толькі адкаталі ваду і на гэтым усё.

У ТЭМУ:

Наколькі небяспечна піць калодзежную ваду? Звярнемся да дзяжаўных сродкаў масавай інфармацыі. Напрыклад, Белтэлерадыекампанія абвесціла, што ў Мінскай вобласці з пяці з паловай тысяч калодзежаў больш за паўтары тысячы ўтрымліваюць ваду, якая з'яўляецца непрыдатнай для піцця. Што тычыцца Магілёўшчыны, то старшыня абласнога Савета Уладзімір Панцюхоў прызнаў у мінулым годзе, што зваротаў грамадзян, якія хвалююцца за чысціню калодзежаў і водаправодаў, апошнім часам паболела. І гэта мае свае падставы. У 2012 годзе кожны пяты аналіз калодзежнай вады ў Магілёўскай вобласці паказаў, што па санітарна-хімічных паказчыках яна не адпавядае гігіенічным нарматывам. У звязку з гэтым спецыялісты рэкамендуюць штогод чысціць калодзежы, а пры патрэбе дэзінфіцыраваць хлорнай вапнай. Нават калі герметычнасць калодзежных кольцаў не парушана, пажадана час ад часу здаваць ваду на бактэрыялагічны аналіз у санэпідэміялагічную службу.

КОРРУПЦИОНЕРЫ В БЕЛЫХ ХАЛАТАХ

Тимур НЕЗВАНОВ

Иногда определить разницу между взяткой и благодарностью нелегко, особенно в медицине, где между врачами и пациентами существуют особые, специфические взаимоотношения. Об этом свидетельствуют опросы общественного мнения, а также анализ уголовных дел коррупционной направленности. Например, в 2012 году правоохранительные органы каждый месяц заводили по несколько дел о взяточничестве в системе здравоохранения. А ведь кроме поборов и подношений выявлялись и другие корыстные преступления. Об одном из установленных злоупотреблений, совершённом должностным лицом Климовичской районной больницы, стало известно совсем недавно.

В конце весны в «Рэспубліке» появилось интервью, которое дал газете прокурор Могилёвской области Александр Чадюк. Оно было посвящено борьбе с коррупцией среди медицинских работников Могилёвщины. По заявлению прокурора, в ходе проверок недостатков и упущений было «вскрыто немало в самых различных направлениях». Для подтверждения перечислялись конкретные факты, давалась характеристика совершённых незаконных действий. Среди перечисленных примеров отдельно было упомянуто происшествие в Климовичском районе.


Александр Чадюк: «В минувшем году Климовичским районным отделом Следственного комитета Республики Беларусь проводилась проверка в порядке ст.174 УПК Республики Беларусь (решения, принимаемые по заявлениям или сообщениям о преступлениях) в отношении заместителя главного врача по амбулаторно-поликлинической работе УЗ «Климовичская центральная районная больница». Она, работая в данной должности, а по совместительству — участковым врачом-терапевтом, используя своё служебное положение, в течение трёх месяцев фактически не выполняла обязанности врача-терапевта, но составляла фиктивные ведомости о якобы произведенных ею посещениях и лечении амбулаторных больных. Тем самым предприимчивый руководитель завладела незаконно выплаченными ей в качестве заработной платы денежными средствами в размере почти двух миллионов рублей.


Учитывая, что эта женщина в полном объёме добровольно возместила причиненный ущерб, в содеянном раскаялась, Климовичским РОСК в отношении её на основании п. 11 ч. 1 ст. 29 УПК Республики Беларусь (наличие оснований для освобождения от уголовной ответственности) вынесено постановление об отказе в возбуждении уголовного дела по ч. 1 ст. 210 УК Республики Беларусь (хищение путем злоупотребления служебными полномочиями). Прокуратура района с принятым решением согласилась».

НОВОСТИ РЕГИОНА

ШТРАФУЮТ С РАЗМАХОМ

Комитет государственного контроля Могилёвской области сообщил корреспонденту БЕЛТА об установленных в этом году нарушениях порядка внешнеторговых операций. В поле зрения КГК попали восемь организаций, в том числе ОАО «Климовичский комбинат хлебопродуктов». Как передаёт БЕЛТА, все организации, а также 9 их должностных лиц были оштрафованы. Общая сумма наложенных штрафных санкций составила более миллиарда рублей.





КАК НАС УЧАТ БЕРЕЖЛИВОСТИ. ЧАСТЬ 4

Александр ВЛАД

Сегодня мы публикуем завершающую часть цикла статей на тему «Как нас учат бережливости». Разумеется, тема не исчерпана до конца. Но мы всё-таки решили подвести итог, а напоследок расскажем нашим читателям, как и у кого можно научиться бережливости.



То, что необходимо учиться, надеюсь, сомнения не вызывает. Отечественный опыт хозяйствования ежедневно и ежечасно подтверждает — так жить нельзя. Вот и в начале этого года жителям Климовичского района расписали, как здорово и удачно УКП «Коммунальник» реализовал проект по ликвидации неэффективных тепловых сетей в агрогородке Тимоново. На улицах агрогородка из эксплуатации вывели несколько километров теплотрассы, а взамен жителям установили газовые котлы индивидуального пользования. Как сообщает районная газета, сэкономили миллиарды рублей.

Согласиться с этим можно только частично. Очевидно, что затраты на укладку новых труб «кусаются», поэтому решили, что дешевле обойтись установкой газовых котлов. Конечно, расход газа теперь будет меньше, но для нас более существенно то, что, как пишет районка, старые трубы «фактически больше подогревали землю, чем приносили тепло в дома». За отопительный сезон терялось 350 миллионов рублей. Вот он, отечественный опыт хозяйствования, в действии.

А как же с этим у них, в европах и америках? Эксперты указывают, что Европа импортирует около 60% всей потребляемой энергии, то есть в этом плане не роскошествует. И это вынуждает постоянно заботиться о развитии и внедрении энергосберегающих технологий, хотя богатые европейцы могли бы позволить себе «подогревать землю». Но они, наоборот, предпочитают тратить время и средства рачительно и разумно. Это проявляется даже в мелочах. К примеру, во многих европейских странах действуют субсидии и скидки, если при покупке бытовой техники отдаётся предпочтение более энергоэффективной. А в Германии практикуется льготное кредитование, а впоследствии полное или частичное освобождение от налогов производителей энергоэффективных технологий и оборудования.

На протяжении долгого времени Евросоюз проводит планомерное повышение энергоэффективности зданий в странах Европы. Это означает энергетическую паспортизацию зданий, их эффективную термоизоляцию, регулярный осмотр и др. Существует целая нормативная база, разрабатывается единый подход к энергосертификации на территории ЕС. Так 19 мая 2010 г. Европарламент принял требования к энергоэффективности зданий. В виде национальных стандартов стран Евросоюза они должны быть признаны странами к 2014 г. с соответствующим внедрением этих стандартов до 2020 г. В результате в Нидерландах, Дании, Норвегии, Германии запланировано снижение энергопотребления зданий в 2020 году примерно в 3 раза по отношению к уровню 2010 г. А для вновь строящихся зданий к 2030 г. запланирован так называемый нулевой уровень энергопотребления, т.е. здания должны обеспечиваться за счёт собственных источников энергоснабжения (солнечные батареи, ветрогенераторы, тепловые насосы и т.д.).


Бывшие республики СССР, взявшие сегодня европейский курс развития, успешно применяют опыт энергосбережения стран ЕС. Показательно в этом плане сотрудничество Литвы и Евросоюза. При составлении Строительного технического регламента Литовской Республики STR 2.01.09–2005 «Энергетическая эффективность зданий. Энергетическое сертифицирование» за основу была взята директива Европарламента «Энергетическая эффективность зданий» и сопутствующие стандарты. Это позволило качественно улучшить требования к энергетической эффективности зданий. Теперь в Литве энергосертифицированию подлежат новые здания, построенные по проектной документации выпуска не раньше 2006 года, все государственные здания с 2007 года, а с 2009 года — все здания при их продаже или ренте. Исключение составляют здания — объекты культурного наследия и религиозного назначения, временные и летние постройки, малые здания отапливаемой площадью до 50 м2.

Мне приходилось бывать в Литве и самому убеждаться в результатах применения европейского опыта энергосбережения. Например, терморегуляторы и счётчики по расходу тепла принято устанавливать на каждую батарею. Если жильцы дома хотят коллективно поставить энергосберегающие окна, то на эти цели выдаются кредиты с выплатой на 20 лет. За капремонт, кстати, литовцы не платят, да и Министерство ЖКХ у них отсутствует. Белорусы тоже могут жить как в Литве, если захотят жить, как живёт вся Европа.

НОВОСТИ РЕГИОНА

ПОЕДЕМ БИЗНЕС-КЛАССОМ

С 26 мая железная дорога переходит на новый график работы. В связи с этим серьёзно меняется расписание движения поездов. Также появляются новые рейсы и направления. В частности, это прямой рейс из Могилёва в Коммунары, что позволит без пересадок добираться в Климовичи и Костюковичи. Сообщается, что новые поезда региональных линий бизнес-класса сообщением «Могилёв-Коммунары» будут курсировать 2 раза в день. Они будут идти с остановками в Чаусах, Кричеве, Климовичах.





“БУЛЬБАШЪ” ЯК КАНЕЦ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ

Ясь ГАСПАДАР

Уявіце: у адным з прэстыжных кварталаў Нью-Ёрка адкрываецца забаўляльны цэнтр “Нігер-хол”. Ці, напрыклад, на адной з плошчаў старадаўняга Рыма працуе кавярня “Макароннік”, а ў Парыжы збірае наведвальнікаў закусачная-бістро “Жабаед”. Ці, каб далёка не хадзіць, у львоўскай краме прадаецца гарэлка “Хахол”, расіяне запускаюць гандлёвую марку “Маскаль”, а выхадцы з Каўказу засноўваюць рэстаран “Чурка”… Ну як? Не ўяўляеце? Вось і я не ўяўляю. А ў Беларусі нешта падобнае адбываецца на вачах ва ўсіх. І амаль усім абыякава.

Ні ў якім выпадку аўтар гэтых радкоў не хацеў абразіць прадстаўнікоў згаданых народаў – наадварот, ён ставіцца да іх з глыбокай павагай. І з гэткай жа павагай хацеў бы ставіцца да сваіх суайчыннікаў. Але вось адкуль узяцца гэтай павазе, калі дагрукацца да так званай “нацыянальнай самасвядомасці” гэтых суайчыннікаў становіцца ўсё цяжэй? І прыклады доўга шукаць не трэба.

Узяць хоць бы маё роднае мястэчка Клімавічы. Зайшоўшы ў малочны бар (на першым паверсе рэстарана “Світанак”), дзе ў дзяцінстве даводзілася есці смачнае марозіва, я мякка кажучы, здзівіўся. На ўваходзе мяне шырокай усмешкай сустрэў намаляваны вусаценькі-пузаценькі мужычок ў саламяным капелюшы. А на саміх дзвярах вісела шыльда “Кафэ “Бульбаш”, якой раней, здаецца, не было. Спачатку прыйшла ў галаву думка, што гэты пункт грамадскага харчавання раптам стаў спецыялізавацца на чыпсах, пюрэ, драніках і іншых бульбяных прысмаках. Потым у памяці ўсплыла назва алкагольнага прадукту “Бульбашъ”. Дайшло: напэўна, гэта проста мясцовая даніна ганебнай беларускай модзе апошніх часоў.


Пра алка-прадукт “Бульбашъ” трэба казаць асобна. Неабыякавыя грамадзяне ўжо звярталі ўвагу на публічнае ўжыванне крыўднай для беларусаў мянушкі. Яшчэ ў 2008 годзе віцебчук Сяргей Каваленка палічыў назву таго самага прадукту “Бульбашъ” абразлівай. Спачатку ён прапанаваў кіраўніцтву завода вінаградных вінаў “Дыяніс” выключыць гэтую назву з асартыменту, а потым дадаткова звярнуўся з заявай у пракуратуру Першамайскага раёна Віцебска. У выніку Сяргей Каваленка атрымаў афіцыйны адказ ад кіраўніцтва прадпрыемства: нам, маўляў, пра абразлівы сэнс слова нічога не вядома і ніякага прыніжэння ў такой назве мы не бачым. Больш таго, кіраўніцтва паспрабавала абвінаваціць самога Сяргея Каваленку ў распальванні нацыянальнай варожасці… Абіванне парогаў органаў улады нічога, зразумела, не прынесла.

Дадамо, што напой і цяперака прадаецца, яго назва не змянілася, а на сайце прадпрыемства напісана наступнае: “Бульбашъ” даёт возможность почувствовать дух щедрой и богатой белорусской земли, прикоснуться к корням, ощутить истоки традиций”. І відаць, настолькі добра гэты брэнд зарэкамендаваў сябе, што сёлета завод “Дыяніс” быў перайменаваны ў “Завод Бульбашъ”.

Далей – болей. Нядаўна пад Мінскам ледзьве не пабудавалі цэлы забаўляльны комплекс “Бульбаш-хол”, з рэстаранам і лазьняй. І дзе — ля мемарыялу Курапаты, на месцы масавых сталінскіх расстрэлаў, на якім пахаваны тысячы беларусаў! Гэтае ўрочышча з’яўляецца ахоўнай зонай, гісторыка-культурнай каштоўнасцю, своеасаблівым нацыянальным сімвалам, святыняй. “Найлепшае” месца для застольнага адпачынку на касцях, ды яшчэ пад такой “талерантнай” назвай… На шчасце, у справу ўмяшаліся грамадскія актывісты, восенню мінулага года сталі збіраць подпісы супраць гэтага недарэчнага і злачыннага будаўніцтва. Органы ўлады ў выніку вымушаны былі прызнаць, што работы вядуцца з парушэннямі, а потым і наогул прыпынілі будоўлю. Пакуль на паўгады, а што будзе далей, сказаць цяжка.

Вам не здаецца, што неяк на дзіва паслядоўна і адкрыта адбываецца гэта “бульбашызацыя”?.. І самае прыкрае, што меркаванне пра бяскрыўднасць “бульбаша” (а яго можна лічыць афіцыйным) не такое далёкае ад меркавання многіх беларусаў. Вось такі выпадак здарыўся з маім знаёмым вандроўнікам. Неяк занесла яго ў Заходнюю Украіну, дзе завязалася размова з мясцовымі жыхарамі, вядомымі сваім шчырым патрыятызмам. І закарцела нашаму земляку пацікавіцца ў львоўскага хлопца: “Слухай, а чаму вы, украінцы, так крыўдуеце, калі вас называюць “хахламі”?” Зразумела, пачуўшы абразлівую для сябе мянушку, украінец наліўся чырванню ажно да самога “осэлэдца” і раз’юшана выгукнуў: “Што ты сказаў?! Ты… ты… Бульбаш!!!”. І здагадайцеся, якая рэакцыя была ў беларускага “патрыёта”? Паціскання плячыма і збянтэжана-здзіўленае: “Ну, бульбаш…Ну і што?”. Тыповая рэакцыя, праўда?

А нават калі ў каго і ўздымецца ў душы пачуццё нацыянальнай і агульначалавечай годнасці? Куды і каму скардзіцца на амаль блатное слоўца “бульбаш”? Дзяржава, якая, па ідэі, павінна абапірацца на патрыётаў і выхоўваць іх, зусім не перашкаджае інтэнсіўнай “бульбашызацыі” грамадства. Ды й мы самі звыкліся з тым, што прадстаўляем сабой людзей без ведання сваёй роднай мовы, культуры і гісторыі. Нам усё роўна, што з такім жыццёвым падыходам беларусы проста не вытрымаюць барацьбы за існаванне з больш канкурэнтаздольным відам — “бульбашом звычайным”. А неўзабаве гэты “бульбаш”, як добры прыстасаванец, зусім мімікрыруе – пад расейца, кітайца ці лепей адразу пад каларадскага жука. Ёсць бульба на стале — і добра! Іншыя каштоўнасці ў разлік не прымаюцца. Ну, хіба яшчэ пляшка настойкі “Бульбашъ” у якасці культурнага складніка, каб “ощутить истоки традиций”… Няўжо ён будзе такім — канец гісторыі Беларусі?





КЛИМОВИЧСКИЙ ЛВЗ — ВНЕ ПРЕСТИЖНОГО РЕЙТИНГА ВОДОК МИРА

Михаил ПЕТРОВ

Белорусская водка «Кристалл» находится в десятке самых продаваемых водок в мире. Как известно, этот алкогольный продукт выпускается в Минске. Таким образом, водка «Кристалл» стала своеобразной торговой маркой нашей страны за рубежом. К сожалению, сказать нечто подобное о продукции Климовичского ЛВЗ мы пока не можем.

О попадании «Кристалла» в престижный рейтинг сообщил в мае текущего года БелаПАН, ссылаясь на пресс-службу концерна «Белгоспищепром». Водка минского завода вновь вошла в топ-10 самых продаваемых водок мира. В минувшем году бренд «Кристалл» занимал девятое место в рейтинге продаж, а в нынешнем переместился уже на седьмое место. На данный момент это лучший и непревзойдённый результат белорусской водочной промышленности. К примеру, другой претендент из Беларуси - водка «Придвинье» Витебского ЛВЗ - получила 27 место.

Одновременно интересно ознакомиться и с общим рейтингом алкогольных брендов мира, который составляют эксперты журнала Drinks International. Здесь также зафиксирован очевидный прорыв «Кристалла», который поднялся с 41–го места (в 2011 году) на 36–е. Для сравнения, упомянутая водка «Придвинье» имеет лишь 128–е место (было 134–е). Что же касается Климовичского ЛВЗ, то в последнее время климовичская водка заметно утратила былые позиции. Если в 2011 году бренд «Климград» занимал 43–е место в мировом водочном рейтинге, то по итогам прошлого года он вообще оказался вне этого авторитетного перечня. Это, видимо, не случайно, так как сейчас на ЛВЗ столкнулись с серьёзной проблемой увеличения складских запасов. По имеющимся сведениям, из-за растущей затоваренности предприятие вынуждено снизить в этом году производство водки и ликероводочных изделий.

Напоследок, ещё одна дополнительная информация в тему, как говорится, для размышления. Газета «На страже», орган Министерства внутренних дел, рассказала о трудовых буднях милиционеров Климовичского района. В очерке среди прочего говорится: «На работе правоохранителей сказывается наличие на территории района РУП «Климовичский ликеро-водочный завод». Поэтому вариант - пойду за самогоном к тёте Мане - это не про Климовичи. Всего правоохранителями изъято около 19 тонн алкогольной продукции. Львиная доля алкоголя — просроченная продукция, которая хранилась на ЛВЗ. На должностных лиц были составлены протоколы».

РЕКОНСТРУКЦИЯ ТУАЛЕТА РЕШАЕТСЯ НА ПРАВИТЕЛЬСТВЕННОМ УРОВНЕ

Александр ВЛАД

Светлые головы отечественной номенклатуры неутомимо покоряют всё новые и новые бумажные высоты. Еженедельно появляется огромное количество различных законов, постановлений, инструкций и прочих порождений чиновничьего воображения. Простым смертным трудно даже представить, сколько и чего можно сотворить за напряжённый восьмичасовой рабочий день в каком-нибудь неприметном главке или управлении. И в этом творческом порыве куда только не заводит слуг народа их бескорыстное желание послужить общественному благу! Даже туда, куда все остальные граждане ходят исключительно по нужде.

Полмесяца назад появилось Постановление Совета Министров РБ от 13.05.2013 № 369 «О возложении ответственности за своевременный ввод в эксплуатацию в 2013 году объектов Государственной инвестиционной программы на 2013 год». В этом документе Правительство перечислило государственные организации и ведомства, ответственные за своевременную реконструкцию тех или иных объектов. К каждому из таких объектов персонально прикрепили высокого чиновника.

К примеру, МВД стало отвечать за строительство комплекса зданий РОВД в городе Ляховичи, а МЧС — за пожарное депо в Минске. Свои объекты получили таможня и налоговики, энергетики и пограничники, Следственный комитет и служба медсудэкспертиз. Даже КГБ стал нести ответственность за ввод в эксплуатацию здания Дрогичинского МРО УКГБ, а Генпрокуратура — за здание прокуратуры Хотимского района. В общем, досталось, как говорится, всем сестрам по серьгам.

Отдельного специального упоминания заслуживает пункт 3 в этом перечне. Министерству культуры поручено закончить до конца года реконструкцию и частичную реставрацию здания Национального академического театра имени Я.Купалы. Тут же указывается, что в том числе должен быть реконструирован общественный туалет в Центральном сквере города Минска. Назначены и ответственные — министр культуры Борис Светлов и зампред Мингорисполкома Игорь Карпенко. Получается, что решение о реконструкции общественного туалета принимается на правительственном уровне. А отвечает за его исполнение крупный столичный чиновник и министр культуры. Тяжело, наверное, нести такое бремя ответственности…




Завершая тему, хочется упомянуть, что в Климовичском районе с этим вопросом тоже есть определённые непонятки. У нас отчитались о выполнении стандартов жилищно-коммунальной сферы. Среди прочего отмечается, что наличие общественных уборных в Климовичах соответствует действующему стандарту — не менее 1 уборной на 1 тысячу человек. Выходит, в городе должно быть минимум 16 общественных уборных, так как городское население составляет сейчас 16 тысяч человек. Но вряд ли климовчане смогут назвать хотя бы несколько таких заведений.

АСТРАВЕЦКАЯ АЭС ВАЧЫМА ЗАТРЫМАНАЙ ЖУРНАЛІСТКІ

Настасся ЯЎМЕН, belsat.eu

Вандроўка на Астравеччыну двух журналістаў і лідара Аб'яднанай грамадзянскай партыі абяцала быць спакойнаю, бо яшчэ напярэдадні ніхто не забараняў апазіцыйным палітыкам бесперашкодна ездзіць па забруджаных радыяцыяй зонах Беларусі. У нашых планах былі гутаркі з жыхарамі, а таксама здымкі цяперашняга этапу будаўніцтва АЭС. Дарогаю з Менску нас ні разу не спынялі, толькі ў Астраўцы мы заўважылі за сабою “хвост”. Прычым аўтамабілі віжуноў змяняліся — агулам іх было 7. Мы дзівіліся гэткай мабілізацыі дзеля некалькіх гасцей са сталіцы!



ЦУДОЎНАЕ ПЕРАЙНАЧАННЕ

Экскурсію нам мусілі правесці мясцовыя актывісты Мікалай Уласевіч ды Іван Крук. Спадар Мікалай, каардынатар кампаніі “Астравецкая атамная — гэта злачынства”, акурат на гэты дзень атрымаў позву ў суд. Відавочна, з мэтаю перадухіліць ягоны ўдзел у “Чарнобыльскім шляху”. Гэта — рэха прапановы Уласевіча правесці ў родным горадзе антыядравы пікет. Выканкам адхіліў зварот актывіста, падкрэсліўшы: “Плошча Леніна служыць месцам правядзення толькі дзяржаўных святаў”.

Дарэчы, уласна горадам Астравец стаў усяго месяц таму. Перад тым ён быў пасёлкам гарадскога тыпу. Цяпер жа новаспечаны горад расце як на дражджах, аднак гэта не выглядае натуральна: на хуткую руку паставілі новыя шматкватэрныя дамы для працаўнікоў станцыі, касметычна абнавілі цэнтр гораду. Чакаецца, што з адкрыццём станцыі насельніцтва Астраўца, дзякуючы прыбылым, павялічыцца ўтрая, з 9 да 30 тысячаў.

Згоды мясцовых жыхароў на будаўніцтва станцыі ніхто не пытаў. Як не пыталі і ў рэшты беларусаў: рэспубліканскага рэферэндуму паводле гэтага пытання гэтак і не адбылося.

Цяпер на будаўніцтве і ў адміністрацыі АЭС працуюць каля тысячы асобаў. Сярод іх — расійцы, якія найчасцей кіруюць будаўнічымі працамі. Будаўнікі наймаюцца з усёй Беларусі, працуюць вахтавым метадам. Міліцыянты скардзяцца, што з іх прыездам у паселішчы вырасла колькасць правапарушэнняў, звязаная перадусім са злоўжываннем алкаголем.

БУДАВАЦЬ НЕЛЬГА СПЫНІЦЬ

У гадавіну чарнобыльскай катастрофы ў Астраўцы — ціха: ні пратэстаў, ні антыатамных плакатаў. Затое прымаў грамадзянаў дэпутат парламенту Адам Кавалька. Мы прыбылі ў заяўлены час, каб абмеркаваць грамадскі розгалас вакол будаўніцтва АЭС. Аднак заспелі на месцы толькі старшыню Варнянскага сельсавету — Марыю Шыманец, якая паведаміла, што Кавалька ўсіх ахвотных прыняў і ўжо з’ехаў. Адказваць замест яго на бягучыя пытанні чыноўніца адмовілася.

Да пляцоўкі будаўніцтва атамнай станцыі было ўсяго некалькі кіламетраў, і мы пастанавілі накіравацца туды. Дарогаю пабачылі ўжо гатовы ўказальнік: «Белорусская АЭС», – хоць аб’екту яшчэ не існуе.

Будоўля раскінулася шырока. Стаіць шмат аўтамабіляў працаўнікоў, чаргою ездзяць фуры, да пляцоўкі пракладаюць рэйкі чыгункі. На тэрыторыі два квадратныя кіламетры ёсць адміністрацыйныя пабудовы, уласны бетонны завод, вырытыя два катлаваны пад рэактары. Паводле Уласевіча, заліты абы-як падмурак першага катлавану ўжо пачаў даваць расколіны.

Кіраўніцтва быццам спяшаецца. У красавіку віцэ-прэм’ер Уладзімір Сямашка заявіў, што працы на будоўлі першага блоку АЭС ідуць з апярэджаннем графіку на 4 месяцы, другога — на 8–10 месяцаў. Ці варта ганарыцца хуткасцю будаўніцтва такога адказнага аб’екту, як атамная электрастанцыя, Сямашка не ўдакладніў.

У АСТРАВЕЦКІМ РАУС. МІЛЦЫЯ З НАРОДАМ?

Старшыня службы аховы астравецкай АЭС чамусьці не пажадаў прадэманстраваць вынікі гэтай сапраўды стаханаўскай працы і выклікаў міліцыянтаў ратаваць “святы аб’ект” ад відэакамеры. Штосьці аператар усё ж паспеў зняць, але і тыя рэдкія кадры яго прымусілі пазней выдаліць. Зрэшты, у архівах дзяржтэлеканалаў багата кадраў з гэтай пляцоўкі: дазвол на здымкі атрымліваюць толькі тыя, хто інтэрпрэтуе іх у слушным кірунку.

У кабінеце маёра, дзе я давала тлумачэнні, вісеў плакат-ідылія “Беларуская АЭС — у гармоніі з прыродаю”.

“А як вы ставіцеся да магчымага суседства з атамнай станцыяй? — пытаюся ў міліцыянта. — Не паспелі ачуняць пасля Чарнобылю, пераўтвараем Астравец у Прыпяць...” — “А хто яго ведае, як да яе ставіцца, – адказвае міліцыянт. – Нам галаўнога болю дадалося, але, можа, мясцовым праца будзе ды электраэнергія таннейшая... Хаця калі ў нас што таннела?”.

Умовы працы на будоўлі няроўныя. Беларускія будаўнікі атрымліваюць каля 4–6 мільёнаў за месяц. Расійскія падраднікі: інжынеры, прарабы ды іншыя — у 10 разоў болей.

АСТРАВЕЧЧЫНА — СТРАТЭГІЧНЫ АБ’ЕКТ

Пакуль мы даказвалі, што не злачынцы ды не шпіёны, міліцыянты затрымалі і Анатоля Лябедзьку. Ягоны аўтамабіль праверылі, ці няма там антыатамных улётак. Мікалая Уласевіча, які мусіў распавесці на “Чарнобыльскім шляху” пра сітуацыю ў Астраўцы, затрымала спачатку астравецкая міліцыя, а затым маладзечанская. Натуральна, у Менск, на акцыю, ён не паспеў.

З малым ліхам пакінуўшы “сардэчных” праваахоўнікаў беларускай ядравай сталіцы, мы ад’ехалі за межы паселішча, каб зрабіць інтэрв’ю з праваабаронцам Іванам Круком. Але і ў лесе нас заспела ўжо знаёмая “цывільная” машына. Працаўнікі ў штацкім абагульнілі, што мы не можам здымаць тут без акрэдытацыі. “У Астраўцы?” — удакладніла мы. “У Рэспубліцы Беларусь”, — не разгубіўся хлопец.

Праўда, аказалася, што іх цікавіць наша актыўнасць не па ўсёй краіне, а толькі на падуладнай тэрыторыі — Астравеччыне. Роўна на мяжы Ашмянскага раёну хлопцы развярнуліся і пакінулі нас.

А мы пакінулі ціхі, мірны, як атам, Астравец, зняць які нам гэтак і не дазволілі.

ПОСЛЕ РАЗГРОМА «МАФИИ» ЦЕНЫ НА ЭЛЕКТРИЧЕСТВО ПОДСКОЧИЛИ

Вадим ЛИВНЕВ, Салідарнасць

С 1 июня электричество для жителей Беларуси дорожает на 15,7%. Такое решение приняло правительство. В этой связи уместно напомнить, что 16 апреля Александр Лукашенко провёл совещание по вопросу функционирования и развития белорусской энергетики. Там глава государства устроил настоящий разнос руководителям отрасли.

Лукашенко отдельно указал на проблему постоянного повышения тарифов на электричество, вызывающую негативную реакцию, как субъектов хозяйствования, так и населения: «На этом начинают активно спекулировать и наши противники. Поэтому мной было поручено Комитету государственного контроля провести детальную проверку обоснованности формирования тарифов».

«Вы душите население, душите предприятия, вы приходите ко мне и постоянно просите и требуете: надо тарифы увеличивать для населения — надо на мусор, на то, на это», – демонстративно возмутился Александр Лукашенко. — «Энергетики сформировали общество, которое можно назвать государством в государстве. Это некая своя независимая организация с элементами мафии и банды».

В результате руководитель Беларуси поручил соответствующим органам разобраться и с санаториями, и с автомобилями, на которых ездят энергетики, и с кредитами, которые они сами себе выдают.

«Порядок должен быть наведён. И он будет наведён, – подчеркнул Лукашенко. – «В течение этого месяца все вопросы должны быть решены».

Спустя пару дней глава Беларуси подписал указ об отставке министра энергетики Александра Озерца — «за провалы в управлении отраслью». Также должностей лишились первый замминистра Эдуард Товпенец и генеральный директор «Белэнерго» Алексей Ширма. Руководитель администрации президента Андрей Кобяков, представляя нового министра Владимира Потупчика, заявил: «Глава государства ждет принципиального доклада о тарифах в энергетике. Надо очень внимательно, детально, непредвзято, именно с позиции общегосударственной взглянуть на систему ценообразования».

Никто, конечно, не ожидал, что с приходом в отрасль нового руководства тарифы на электричество снизятся. Но вот на то, что они какое-то время после такого разноса не будут повышаться, некоторые граждане рассчитывали. Как выяснилось, напрасно.


Несмотря на то, что «мафия» разгромлена, электричество опять подорожало — на 15,7%. К примеру, с 1 июня за 1 кВт.ч в жилых домах (квартирах), оборудованных электроплитами, придется платить 375,9 рубля (сейчас — 324,9 рубля). Такой вот получился «непредвзятый взгляд на систему ценообразования».

Вырисовывается тенденция: если глава государства публично возмущается тем, что цены на что-либо завышены, — значит, жди подорожания…

Сергей АРЖАНЦЕВ

СЕГОДНЯ В ШКОЛЕ ПОДВЕЛИ ИТОГИ…

**Сегодня в школе подвели итоги…
Экзамены, билеты, выпускной.
Впервые до домашнего порога
Дорога стала будто бы иной.
Пускай вокруг всё близко и знакомо,
Но мы уже другие. Навсегда.
И станет грустно после слов у дома:
«Прощайте, наши школьные года!»**



КЛІМАВІЦКАЯ ІНФА-ПАНАРАМА

*Клімавіцкі грамадска-палітычны бюлетэнь
Адказны за выпуск: Аржанцаў Сяргей Юр'евіч
Адрас: Клімавічы, вул. Леніна, д. 27а, кв.15.
Надрукавана на ўласным абсталяванні. Наклад 299 асобнікаў
Распаўсюджваецца бясплатна*